(96,3%) детей, а 1 (3,7%) был переведен в соматическое отделение для лечения сопутствующих заболеваний. Средний показатель койко-дней составил 7,57±0,39.

Выводы:

Лапароскопическая пиломиотомия обладает рядом преимуществ:

1. Хороший косметический эффект;
2. Низкий уровень послеоперационной боли;
3. Быстрее проходит восстановительный период после операции;
4. Снижается срок госпитализации.

Литература:


1. Хирургические болезни у детей. Под редакцией Ю.Ф. Исакова. – М.- 1998.- 704 с.

2. К.У.Ашкрафт, Т. М. Холдер //Детская хирургия:[В 3 т. : Перевод] / 2 т.- СПб.- 1996 – 384с.


## КАЛЯДНЫЯ ВЯЧОРКІ: АСАБЛІВАСЦІ ІХ ПРАВЯДЗЕННЯ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ


**Гарох В.М.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, Беларусь

Кафедра гуманітарных навук

Навуковы кіраўнік – к.г.н., дацэнт С.А. Сіткевіч


Гісторыя беларускага фальклора самабытная і мнагагранная. Вусная народная творчасць фарміравалася на працягу шматлікіх стагоддзяў, таму на сучасны момант яе можна разглядаць як перапляценне язычніцкіх абрадаў з хрысціянскімі звычаямі. Цікавай старонкай фальклору з'яўляюцца народныя гулянні і менавіта тэрытарыяльныя асаблівасці іх правядзення, якія можна знайсці ў кожным рэгіёне. Мэта маёй працы - вызначыць асаблівасці правядзення калядных вячорак у Гродзенскім рэгіёне.

На Гродзеншчыне ў Карэліцкім раёне кідалі чаравік праз хату. У які

Репозиторий ГрГМУ

бок пакажа наском, адтуль прыйдзе суджаны. Калі ж абутак зачэпіцца за штосьці, то дзяўчына замуж пакуль не выйдзе. Акрамя таго, ў гэты вечар пяклі аладкі, кожная дзяўчына пазначала нейкім чынам сваю, клалі іх у радок, пасля пускалі сабак. І вось чыю ён схопіць хутчэй, тая першай і выйдзе замуж [2].

У Іўеўскім і Дзятлаўскім раёнах на багатую куццю таксама пяклі аладкі. Трэба было ўзяць першую ў суседа разам з кавалкам скваркі, выбегчы на двор на тое месца, дзе смалілі "пярэстую свінню", памазаць аладку скваркаю, есці і слухаць, адкуль брэшуць сабакі – з гэтага боку і прыедуць сваты [3].

Ставілі сяброўцы пад сакрэтам пад ложак тазік ці іншы посуд з вадой і клалі трэсачку або галінку як масток. У сне хто дзяўчыну перавядзе цераз яго, той і будзе нарачоным. Галоўнае, каб ніякая сіла не сцягнула з мастка ў ваду, бо гэта знак смерці. Таксама тапілі ў лыжцы воск, а пасля выліваді ў халодную ваду. Цень застылага злепку разглядалі на сцяне і па форме ўгадвалі будучыню. Падобнае рабілі з паперай: спаліўшы, разглядалі абрысы ценю. Яшчэ доўгую жэрдку ставілі роўна ўверх: куды яна ўпадзе, у той бок і пойдзе дзяўчына замуж. Былі і іншыя гаданні. Увогуле гадаць забаранялася, але было павер'е, што ў калядныя вечары Бог даруе гэты грэх.

Таксама калядавалі ("хадзілі па шчадрусе"). Калядаванні суправаджаліся "ваджэннем казы". Каза па старажытных уяўленнях магла павялічваць урадлівасць зямлі. У "казу" перапранаўся хлопец пры дапамозе вывернутага аўчынай уверх кажуха, апраналася маска, рогі маглі рабіцца з саломы. Акрамя таго, быў павадыр або "дзед", з гарбом, у старым адзенні, з доўгімі валасамі і льняной барадой. У гурце прысутнічалі механоша, музыка, маглі быць і іншыя казачныя персанажы. Атрымаўшы дазвол на спевы ў хаце, спачатку заходзіў "дзед" з "казой", за імі астатнія. Спявалі пахвалы гаспадарам і хаце.

Пры гэтым адбывалася муштраванне "казы". Гаспадары абавязкова павінны былі штосьці даць калядоўшчыкам (каўбас, пірага, грошай), не

Рэпазіторый ГрГМУ

даць лічылася дрэннай прыкметай, ды і перад людзьмі сорамна. Вядома, што на Гродзеншчыне сабраныя прадукты затым прадавалі і ўтаргаваныя грошы дзяліліся паміж сабою. У некаторых месцах на гэтыя грошы куплялі іконы і ахвяравалі царкве [1].

Гэта далёка не поўны пералік асаблівасцей калядных святкаванняў, распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі, а менавіта ў яе Гродзенскім рэгіёне. Але нават гэтых фальклорных элементаў на сённяшні дзень, асабліва ў гарадах, захавалася вельмі небагата. Увогуле зварот да нацыянальных звычаяў святкавання з'яўляецца цудоўнай формай культурнага ўзбагачэння, духоўнага росту людзей, штуршком да высокамаральнага выхавання маладога пакалення, дапамагае несці нашчадкам сапраўдныя скарбы духу.

Літаратура:

1.Гродзенская праўда,1996, 24 снежня

2.Памяць: Карэліцкі раён. Гіст-дакументальныя хронікі.-Мінск,2000

3.Голас Радзімы, 2006, 9 лістапада

## ЗАВИСТЬ В ВОСПРИЯТИИ ИНОСТРАННЫХ СТУДЕНТОВ-МЕДИКОВ

**Гаутам А. М., Картекиян В. К.**

Гомельский государственный медицинский университет, Беларусь

Кафедра русского языка как иностранного

Научный руководитель - преподаватель кафедры РКИ М.Г. Ситникова

С целью выявления различий в представлениях студентов о моральных качествах и этических категориях, в число которых было включено и такое социальное явление как зависть, нами было проведено анкетирование, в котором приняло участие более 100 граждан Сирийской Арабской Республики, Арабской Республики Египет, Ливанской Республики, Государства Палестина, Йеменской Республики и Республики Индия, обучающихся в Гомельском государственном медицинском университете.

Репозиторий ГрГМУ